ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

# Гомельскі ўніверсітэт



№ 19 (920) | Пятніца, 27 СНЕЖНЯ 1996 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць два разы ў месяц | Цана дагаворная




*Шаноўныя выкладчыкі, супрацоўнікі, тэхнічныя работнікі, студэнты і аспіранты!*

*Мы перагортваем апошнія лісткі календара. Адыходзіць у гісторыю 1996-ы год. Ён быў вельмі напружаным і насычаным на падзеі, нялёгкім у жыцці. Але нагадваць пра мінулыя дні няма патрэбы. Яны засталіся ў нас у памяці.*

*Галоўнае ў тым, што мы не страчваем надзею. Застаецца ўпэўненасць: будучыня павінна прывесці да дабрабыту. Але для гэтага мы абавязаны прыкласці вялікія намаганні, свае веды, талент і вопыт, стварыць у грамадстве ўзаемаразуменне, адзінства і стабільнасць.*

*З надыходзячым вас Новым 1997 годам! Жадаем плённай працы, паспяховай вучобы, моцнага здароўя, здзяйснення ўсіх мар і імкненняў!*

РЭКТАРАТ.
ПРАФКОМ.
ПРАФКОМ СТУДЭНТАЎ.

## З УЗНАГАРОДАЙ!

*За шматгадовую грамадска-дабрачынную працу і бескарыслівы ўклад у справу рэалізацыі задач Беларускага дзіцячага фонду, аховы інтарэсаў сацыяльна неабароненых дзяцей дацэнт кафедры філасофіі* ***ГАРАНІНА Тамара Пятроўна*** *ўзнагароджана Ганаровай граматай Кабінета Міністраў Рэспублікі Беларусь.*

***

*За шматгадовую плённую навуковую і вучэбную работу па падрыхтоўцы маладых спецыялістаў, актыўны ўдзел у грамадскім жыцці дацэнт кафедры ўсеагульнай гісторыі* ***ГАРАНІН Леў Мікалаевіч*** *узнагароджаны Ганаровай граматай універсітэта.*

## ВЕЧАР СПАРТЫЎНАЙ СЛАВЫ

адбыўся ў актавай зале ГДУ. На ім падведзены вынікі спартыўнага 1996 года, лепшыя выкладчыкі, трэнеры, спартсмены атрымалі ўзнагароды і грашовыя прэміі.

(Справаздачу аб вечары чытайце ў наступным нумары нашай газеты.)

## ПАВІНШАВАЛІ ЮБІЛЯРАЎ

На мінулым тыдні калектывы фабрыкі "Палесдрук" і каледжа мастацтваў імя Н. Сакалоўскага адзначалі свае юбілеі. З нагоды іх 75-годдзя былі шматлікія віншаванні. Прывітальныя адрасы ўручаны юбілярам і ад нашага універсітэта.

## ВІНШУЕМ!

*Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, выкладчыкі, супрацоўнікі і студэнты факультэта фізічнай культуры горача віншуюць аспірантку кафедры* ***АЛФК БАРАНАВУ Таццяну Іванаўну*** *з паспяховай абаронай дысертацыі на атрыманне вучонай ступені кандыдата педагагічных навук.*

***

*Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, калектыў выкладчыкаў, супрацоўнікаў і студэнтаў эканамічнага факультэта горача віншуюць асістэнта кафедры бухуліку, кантролю і* ***АГД КАВАЛЬЧУК Вікторыю Валер'еўну*** *з паспяховай абаронай дысертацыі на атрыманне вучонай ступені кандыдата эканамічных навук.*

***

*Рэктарат, спартклуб, спартыўныя кафедры, усе аматары спорту універсітэта горача віншуюць зборную мужчынскую каманду па баскетболу (трэнер – заслужаны трэнер Рэспублікі Беларусь* ***Б.А.Царыкаў****), якая стала пераможцай студэнцкага чэмпіянату краіны.*

## А.М.СЕРДЗЮКОЎ -- ЧЛЕН-КАРЭСПАНДЭНТ АН БЕЛАРУСІ

На мінулым тыдні ў Мінску прайшлі сходы аддзяленняў і Акадэміі навук Рэспублікі Беларусь. Былі выбраны на вакантныя пасады акадэмікі і члены-карэспандэнты галоўнай навуковай установы краіны.

Па аддзяленню фізікі, матэматыкі і інфарматыкі членам-карэспандэнтам беларускай Акадэміі навук абраны доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар кафедры оптыкі, прарэктар нашага універсітэта па навуковай рабоце Анатоль Мікалаевіч Сердзюкоў. З гэтай нагоды яму нашыя шчырыя віншаванні.

*Да ўвагі першакурснікаў!*

## У ПРАФІЛАКТОРЫЙ -- БЯСПЛАТНЫ ЗАЕЗД

З 29-га студзеня універсітэцкі санаторый-прафілакторый будзе абслугоўваць студэнтаў-першакурснікаў, якім не споўнілася 18 гадоў, на сродкі, выдзеленыя чарнобыльскім фондам. Жадаючыя трапіць у гэты заезд могуць падаваць заявы ў прафком студэнтаў ГДУ (п. І-17 галоўнага корпуса) да 26 студзеня.

***Чарговы заезд ва універсітэцкую здраўніцу пачынаецца з 8 студзеня 1997 г.***

## ПАПАЎНЕННЕ ВУЧОНЫХ

Адзіны ў Беларусі спецыялізаваны Савет па абароне кандыдацкіх дысертацый па спецыяльнасцях "Вылічальныя машыны, комплексы, сістэмы і сеткі" і "Прымяненне вылічальнай тэхнікі, матэматычнага мадэліравання, матэматычных метадаў у навуковых даследаваннях" створаны пры нашым універсітэце. Гэты Савет узначаліў доктар тэхнічных навук, прафесар, загадчык кафедры матэматычных праблем кіравання ГДУ І.В.Максімей. Разам з гомельскімі вучонымі ў яго ўвайшлі пяць шырока вядомых спецыялістаў у гэтай галіне сучаснай навукі з Мінска і два -- з Кіева.

У дзейнасці новага Савета асабліва плённым стаў мінулы тыдзень. На працягу трох дзён запар ішла, і даволі паспяхова, абарона кандыдацкіх дысертацый. Такі факт у жыцці любой ВНУ -- падзея вельмі важная і рэдкасная. Нельга не адзначыць, што з улікам членаў спецыялізаванага Савета да яе мелі прамое дачыненне 22 доктары навук, прафесары. Яны выносілі свой прысуд пры абароне дысертацый, з'яўляліся апанентамі саіскальнікаў вучоных ступеняў.

Шырокая геаграфія навуковых і вышэйшых навучальных установаў, якія сталі цяпер блізкімі для дысертантаў. Гэта -- Усерасійскі інстытут праблем інфарматыкі і вылічальнай тэхнікі, Маскоўскі інжынерна-фізічны інстытут, Кіеўскі політэхнічны інстытут, Інстытут кібернетыкі і Інстытут матэматыкі Нацыянальнай Акадэміі навук Украіны, Белдзяржуніверсітэт, некалькі інстытутаў Акадэміі навук нашай краіны.



Ідзе абарона дысертацыі.

Станоўчыя водгукі на аўтарэфераты дысертантаў дасланы ў спецыялізаваны Савет з Новасібірска, Санкт-Пецярбурга, Масквы, Екацерынбурга, Мінска, Кіева, Чарнаўцоў.

А цяпер пра тых, хто паспяхова абараніў кандыдацкія дысертацыі і пасля атрымання з БелВАКа дыпломаў аб прысуджэнні вучоных ступеняў кандыдатаў тэхнічных навук папоўніць рады вучоных. Сярод іх -- чатыры аспіранты прафесара І.В.Максімея. Гэта -- І.В.Зісельман, С.І.Жогаль, А.В.Вялцістава і грамадзянін Егіпта Мухсін Ахмед Вагіх. Дарэчы, гэта трэці іншаземец, які абараніў кандыдацкую дысертацыю пад навуковым кіраўніцтвам прафесараў ГДУ.

Пад навуковым кіраўніцтвам прафесара І.А. Атаўмяна з МІФІ напісала і абараніла кандыдацкую дысертацыю выпускніца аспірантуры ГДУ А.І.Яськова. Былы прафесар кафедры вышэйшай матэматыкі Р.В.Шаймуратаў, які доўгі час выкладаў у нашым універсітэце, а цяпер працуе на радзіме ў г.Казані, з'яўляўся навуковым кіраўніком у саіскальніцы вучонай ступені Л.М.Марчанка.

Яшчэ на аднаго кандыдата навук прыбавіцца ў Гродзенскім дзяржаўным універсітэце імя Янкі Купалы. Кандыдацкую дысертацыю абараніў у Гомелі старшы выкладчык гэтай ВНУ А.М.Кадан (навуковы кіраўнік -- дацэнт БДУ В.М.Драбышэвіч).

**Б.ВАЛОДЗІН.**
**Фота У.ЧЫСЦІКА.**

## ПАДАРУНКІ -- НА РАДАСЦЬ

Няма ў дзяцей свята больш любімага, чым Новы год з вясёлымі карагодамі вакол лясной прыгажуні-ёлкі, з Дзедам Марозам і Снягуркай, з цацкамі і ласункамі. Мамы і тады ў гэта свята асабліва стараюцца парадаваць сваіх хлопчыкаў і дзяўчынак. Аднак, на жаль, не ўсе дзеткі маюць бацькоў, якія акружалі б іх сваёй пяшчотай і ласкай, а хтосьці з іх пакутуе і на розныя цяжкія хваробы. Таму стварыць ім па-сапраўднаму святочны настрой імкнуцца людзі з адкрытай душой і добрым сэрцам.

Па традыцыі ў нашай рэспубліцы ў пераднавагоднія дні праводзяцца дабрачынныя акцыі для дзяцей, пакрыўджаных лёсам. Сёлета яна носіць назву "Мы -- дзецям", ініцыятарам яе з'яўляецца Кабінет Міністраў Рэспублікі Беларусь, Беларускі дзіцячы фонд.

Як заўсёды, актыўнымі ўдзельнікамі гэтых дабрачынных акцый з'яўляюцца студэнты ГДУ імя Ф.Скарыны -- будучыя педагогі, тыя, хто вывучае этыку і эстэтыку, праходзіць спецыялізацыю "Арганізацыя і методыка пазашкольнай і пазакласнай работы". У пераднавагоднія дні разам з абласным аддзяленнем Беларускага дзіцячага фонду, дзіцячай школай мастацтваў N1, гомельскім філіялам мінскага мастацкага вучылішча пры Акадэміі мастацтваў, Палацам піянераў і навучэнцаў, СШ N44 г.Гомеля, культурным цэнтрам універсітэта яны правялі дабрачынныя навагоднія ёлкі, у час якіх сабралі самыя розныя падарункі для дзяцей-сірот, інвалідаў, з малазабяспечаных і мнагадзетных сем'яў. Першымі ў гэтай высакароднай справе аказаліся пяцікурснікі фізічнага факультэта. Другакурснікі спецыяльнасцей "Бухулік, кантроль і АГД", "Геаграфія", завочнікі-матэматыкі (5 курс) парадавалі навагоднімі падарункамі выхаванцаў Гомельскага дзіцячага дома сямейнага тыпу, а пяцікурснікі геолага-геаграфічнага факультэта -- дзяцей, хворых на цэрэбральны параліч, якія праходзяць лячэнне ў цэнтры рэабілітацыі.



Пастаянным адрасам наведвання студэнтамі ГДУ і вучнямі СШ N44 стаў у пераднавагоднія дні Журавіцкі дом-інтэрнат. Там абавязкова дачакаюцца іх прыезду з падарункамі і сёлета.

Выставачная зала ГДУ пераўтваралася ў дні правядзення дабрачынных ёлак у сапраўднае казачнае царства дабрыні, пяшчоты і спагады.

**Т.ДУБЯК.**

***На здымку:*** **студэнты фізічнага факультэта на дабрачыннай навагодняй ёлцы.**

**Фота У.ЧЫСЦІКА.**



*Слова пра стыпендыятку Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь*

## ГАНАРОВА І АДКАЗНА

Навагодняе свята для большасці людзей -- самае любімае і доўгачаканае. Для Марыны -- таксама. Яна з радасцю рыхтуецца да яго, у святочную навагоднюю ноч загадвае сваё самае патаемнае жаданне. Бо менавіта ў гэтую адзіную ноч з усяго каляндарнага года мы, не зважаючы ні на якія абставы, працягваем верыць у цуд, казку, ва ўсё самае лепшае...



Кажуць, што калі чалавек чагосьці вельмі моцна жадае, ён зробіць усё для таго, каб гэта стала рэальнасцю. І гэта ўдаецца людзям мэтанакіраваным, моцным духам і характарам. Марына Булавік, студэнтка 4 курса эканамічнага факультэта, з такіх людзей. Не выпадковасцю, а яе вялікім працалюбствам, настойлівасцю, здольнасцямі можна растлумачыць поспех у вучобе -- яшчэ са школьных гадоў і па сённяшні дзень яна вучыцца на адны пяцёркі. З залатым медалём закончыла СШ N38 г.Гомеля, пасля заканчэння падрыхтоўчых курсаў пры ГДУ датэрмінова з поспехам вытрымала прафілюючы экзамен і стала студэнткай ГДУ. Прывабіла тады дзяўчыну новая для універсітэта і вельмі неабходная спецыяльнасць "Эканоміка і кіраванне: менеджмент". Новы час патрабуе і новых падыходаў да вырашэння надзённых задач у эканоміцы. Марыне хацелася гэтае новае зведаць, засвоіць, каб потым прыступіць да самастойнай працы з надзейным багажом неабходных ведаў. А каб яго атрымаць, толькі выдатнай вучобы, на думку М.Булавік, недастаткова. Таму актыўны ўдзел у розных алімпіядах быў для яе дадатковай праверкай сябе, сваіх здольнасцей. Так, напрыклад, было яшчэ ў мінулым навучальным годзе, калі разам са сваімі лепшымі аднакурснікамі прымала ўдзел у рэспубліканскай алімпіядзе па менеджменту, якая праходзіла ў Беларускім дзяржаўным эканамічным універсітэце. Студэнты ГДУ здолелі заняць у ёй другое агульнакаманднае месца, а Марына стала пераможцай у асабістым заліку і была заахвочана грашовай прэміяй.

Адыходзячы 1996-ы год будзе для Марыны Булавік асабліва памятным: яна стала стыпендыяткай фонда Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

-- Гэта вельмі ганарова для мяне асабіста, -- гаворыць Марына, -- але і не менш адказна як, у першую чаргу перад сабой, так і перад аднакурснікамі. Калі на цябе ўскладзены вялікі давер з боку кіраўніцтва універсітэта, факультэта, трэба яго абавязкова апраўдваць.

Ёсць у дзяўчыны адно вялікае жаданне: дасканала вывучыць нямецкую мову. Яна захапляецца ёй яшчэ са школьных гадоў, неаднаразова была пераможцай раённых і абласных алімпіяд. Напачатку нават збіралася паступаць у Мінскі лінгвістычны універсітэт (былы інстытут замежных моў), але, на жаль, жыццёвыя абставіны не дазволілі гэта зрабіць. Затое цяпер эканоміка і замежная мова ўзаемапераплятаюцца, не перашкаджаюць адно аднаму. Сучасны эканаміст з выдатным веданнем адной з замежных моў абавязкова будзе запатрабаваны грамадствам.

Марына, наогул, чалавек цікавы, рознабаковы. Яна шмат змагла ўбачыць у час гастроляў як па краіне, так і за мяжой узорнага ансамбля бальнага танца "Палеткі", актыўнай удзельніцай якога з'яўлялася з першых і да апошніх школьных гадоў. Трэба дадаць, што М.Булавік яшчэ і вялікі аўтааматар, атрымала правы на ваджэнне аўтамабіля.

...Зусім хутка засвецяцца ў нашых дамах зіхатлівымі рознакаляровымі агеньчыкамі прыгажуні-ёлкі. У навагоднюю ноч будуць гучаць словы самых шчырых віншаванняў, пажаданняў: шчасця, здароўя, кахання, ажыццяўлення мар. Няхай такім жа радасным і прыемным, як і гэты адыходзячы ў гісторыю 1996 год, будзе для Марыны Булавік год наступны.

**Т.ДУБЯК.**
**Фота У.ЧЫСЦІКА.**

## НЕ СЯРПАСТЫ, МАЛАТКАСТЫ, А БЕЛАРУСКІ ПАШПАРТ

У снежні пачалося ўручэнне беларускіх пашпартоў новага ўзору. Самыя паважаныя жыхары беларускай сталіцы атрымалі іх з рук Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А.Р.Лукашэнкі.

У Гомелі пашпарты новага ўзору ўручаў групе яго лепшых прадстаўнікоў старшыня гарвыканкома С.В.Шапавалаў. Сярод тых, хто быў удастоены гэтага гонару, доктар педагагічных навук, акадэмік Беларускай акадэміі адукацыі, прафесар кафедры педагогікі нашага універсітэта, Герой Сацыялістычнай Працы М.А. Дзмітрыеў і першакурснік юрыдычнага аддзялення гісторыка-юрыдычнага факультэта Уладзімір Жораў.



***На здымку:*** С.В.Шапавалаў уручае пашпарт новага ўзору М.А.Дзмітрыеву.

# ЛЕКЦЫІ ФРАНЦУЗСКІХ ВЫКЛАДЧЫКАЎ

Франка-беларускі інстытут кіравання пры Гомельскім дзяржаўным універсітэце імя Ф.Скарыны паспяхова праходзіць шлях свайго станаўлення. Перш за ўсё прымаюцца неабходныя меры для выканання ў поўным аб'ёме навучальнай праграмы і глыбокага засваення студэнтамі вывучаемых курсаў. У Гомель рэгулярна прыязджаюць з лекцыямі выкладчыкі з Оверньскага універсітэта горада-пабраціма Клермон-Феран. Так, у першай палове снежня наш горад наведала пяць французскіх спецыялістаў. Філіп Гітар правёў семінары з выкладчыкамі кафедр замежных моў па выкарыстанню камп'ютэраў у навучальным працэсе і, у прыватнасці, пры вывучэнні замежных моў. Фаб'ен Тайарда прачытаў для студэнтаў лекцыі па агульнаму і аналітычнаму бухгалтарскаму ўліку.

Чатыры дні запар выступалі перад студэнтамі Франка-беларускага інстытута кіравання Роберт Фаржэкс, Бруно Баржэ і Мары-Антуанет Дзюбост. Імі былі прачытаны лекцыі адпаведна па мастацтву дзелавых зносін; еўрапейскаму праву; арганізацыі і агульнай палітыцы прадпрыемстваў.

Выкладчыкі з Францыі прыязджалі ў горад над Сожам за сродкі, выдзеленыя на міжнародную адукацыйную праграму "ТЭМПУС".



Перад студэнтамі Франка-беларускага інстытута кіравання выступаюць выкладчыкі Оверньскага універсітэта Бруно Баржэ (справа), Роберт Фаржэкс.

**Б.ВАЛОДЗІН.**
**Фота У.ЧЫСЦІКА.**

## СОРАСАЎСКІЯ СТЫПЕНДЫЯТКІ



Па-сапраўднаму "ураджайным" на студэнцкія таленты ў вучобе, навуковай рабоце стаў у бягучым навучальным годзе матэматычны факультэт. Адразу тры яго выхаванкі чацвёртакурсніцы з педагагічнага аддзялення Вольга Шпырко, Таццяна Дзіндзікава і Ірына Калашнік сталі Сорасаўскімі стыпендыяткамі. Цікава і тое, што ўсе яны з адной акадэмічнай групы -- М-43.

Выдатныя веды, пастаянная праца над сабой, жаданне дасканала вывучыць любімы прадмет -- матэматыку -- вось з чаго складаецца поспех трох сябровак. Нагадаем, што В.Шпырко да таго ж удастоена і стыпендыі імя Ф.Скарыны і наша газета пісала аб ёй ў адным з папярэдніх нумароў.

***На здымку:*** Т.Дзіндзікава і І.Калашнік.

**Фота У.ЧЫСЦІКА.**

## У ПАДАРУНАК -- ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

Яшчэ дзвума экземплярамі ўнікальнага найцікавейшага выдання -- амерыканскай энцыклапедыі ў 22-х тамах папоўнілася універсітэцкая бібліятэка. Гэта шчодры падарунак ГДУ ад фонду "САБРЭ" (ЗША), які аказвае такую дапамогу многім ВНУ Беларусі. У пачатку бягучага навучальнага года наш універсітэт ужо прымаў ад яго гуманітарны груз з вучэбнай і мастацка-пазнавальнай літаратурай, сярод якога была названая энцыклапедыя. Цяпер у ГДУ яе будзе ўжо 3 экземпляры.

**(Наш кар.)**

## НЯЗГАСНАЯ ЗОРКА ПЕСНЯРА

9 снежня 1891 года на небасхіле беларускай паэзіі ўзнікла новая зорка -- нарадзіўся выдатны, дзіўнага таленту мастак слова -- Максім Багдановіч. Самотная зорка яго-най творчасці адразу прычароўвае вока сваім містычным, прывідным, нават нейкім няісным святлом. Параўнаць Максіма Багдановіча немагчыма ні з кім: не таму, што няма лепшых за яго паэтаў, а таму, што ён ні да каго не падобны. Кароткім быў жыццёвы шлях Максіма, яшчэ карацейшым -- творчы. І толькі дзякуючы сваёй геніяльнасці ён здолеў вырвацца з вузкіх часавых рамак свайго зямнога быцця, каб сягнуць у Неўміручасць...

У нашым універсітэце прайшла вечарына, прысвечаная Максіму Багдановічу. Ладзіла яе гомельская маладзёжная культурна-гістарычная суполка "Талака". Распачаў вечарыну загадчык кафедры беларускай літаратуры прафесар І.Ф. Штэйнер. За час сваёй невялічкай прамовы ён здолеў стварыць у зале хвалюючую атмасферу далучэння да вытокаў творчасці Максіма Багдановіча, да трагічнага лёсу паэта.

Рамантычны, лірычны настрой, сугучны чароўнай паэзіі Максіма, стваралі вядучыя вечарыны -- аўтарка гэтых радкоў і Юнэля Сальнікава, студэнткі філфака. Гучалі лепшыя, не вядомыя шырокаму колу чытачоў вершы Максіма. Слухачы сустракалі апладысментамі з'яўленне на сцэне талакоўцаў, якія ўклалі сваю душу ў тое, каб стварыць яркія, арыгінальныя вобразы персанажаў Багдановічавай паэзіі. Гэта -- крыважэрны Лясун і загадкавы Змяіны Цар у выкананні Андруся Асмалоўскага; гэта і поўны трагізму вобраз Самнабула, характар якога выдатна ўвасобіла Ларыса Шчыракова. Светлы сум і таямнічасць вобразаў русалак, чароўнасць ціхай летняй ночы ў лірычных малюнках паэта яскрава перадала Таццяна Адамава. Пранікнёна чытаў лірычныя вершы Багдановіча Дзяніс Міхасёў.

Не кожны ведае, што на словы Максіма створана мноства цудоўных песень -- і ўсхвалявана-рамантычных, апяваючых хараство Бацькаўшчыны і чароўнасць яе прыроды, і патрыятычных. Яны прагучалі на вечарыне ў выкананні старшыні "Талакі" Сержука Вінаградава, цудоўны музычны талент якога не абмяжоўваецца рамкамі сучаснасці: старшыня суполкі зрабіў старажытны беларускі інструмент -- дуду і навучыўся на ёй граць.

Шмат давялося папрацаваць талакоўцам, каб вечарына адбылася на сапраўды высокім узроўні.

**Таццяна КОНЮХАВА,**
**студэнтка групы РБ-42 філалагічнага факультэта.**



Абрадам -- жыць

# ШУМЕЛІ ВЯСЕЛЛІ...

На працягу аднаго з тыдняў снежня першакурснікі філалагічнага факультэта жылі ў некалькі незвычайнай атмасферы -- святочнай прыўзнятасці і хвалявання. Па чарзе ў розных акадэмічных групах -- беларускіх, беларуска-рускіх і беларуска-англійскай праводзіліся адкрытыя заняткі па фальклору. Праслухаўшы лекцыі па гэтай дысцыпліне, студэнты павінны былі паказаць, як засвоілі тэарэтычны матэрыял, у прыватнасці, па тэме "Беларускае вяселле". Яны зрабілі інсцэніроўкі вясельнага абраду, што бытуе на Палессі, а таксама ў іншых рэгіёнах, асабліва тых, якія мяжуюць з Расіяй.



Фальклорная лабараторыя, некаторыя аўдыторы факультэта пераўтварыліся часова ў сялянскія хаты, дзе разгортваліся цікавыя дзеянні -- фрагменты вяселляў са сваімі мясцовымі адметнасцямі: сватанне, купля-продаж нявесты, заручыны, "зборная субота" або вяночкі, ад"езд маладых у царкву і самы кульмінацыйны момант -- дзяльба каравая -- сімвала дабрабыту, шчаслівага сямейнага жыцця.



Адпавядаючая ўсяму гэтаму атрыбутыка -- і касцюмы, і рэчы побыту, музыка, песні, танцы, само застолле са смачнымі пірагамі, пячэннем, вясельным караваем (іх спяклі "на славу" сапраўдныя майстры кандытарскай справы), іншымі прысмакамі, добрае выкананне студэнтамі сваіх роляў: сватоў, дружак, жаніха і нявесты і г.д. -- усё гэта дазваляла яскрава ўявіць шматлікім гледачам, гасцям цікавасць, маляўнічасць, непаўторнасць вясельнага абраду.

Студэнты імкнуліся выкарыстаць у інсцэніроўках фрагментаў беларускага вяселля не толькі тэарэтычныя веды, але і багатыя фальклорныя запісы вясельных абрадаў Гомельшчыны, што сабраны ў архівах фальклорнай лабараторыі факультэта.

**Т.НІКАЛАЕВА.**
**Фота У.ЧЫСЦІКА.**

## СЕМІНАР ПАЛІТОЛАГАЎ

Павышэнне прафесіянальнай кваліфікацыі выкладчыкаў цяпер з'яўляецца вельмі важнай праблемай для вышэйшай школы. Раней існаваўшыя традыцыйныя метады яе вырашэння (камандзіраванне ў ФПК, ІПК і г.д.) па фінансавых прычынах зараз прымальныя, на жаль, толькі ў выключных выпадках. У дадзенай сітуацыі пошук новых шляхоў, форм і метадаў павышэння кваліфікацыі, якія адпавядаюць фінансавым магчымасцям, стала неабходнай умовай захавання і развіцця дасягнутага ўзроўню педагагічнага майстэрства і прафесіянальных ведаў выкладчыкаў. Натуральна, станоўчы вынік у гэтым напрамку можа быць атрыманы пры наяўнасці не толькі жадання, але і актыўных дзеянняў, ініцыятыў, у першую чаргу, з боку кафедр універсітэта.

Першыя крокі ў гэтай справе зроблены кафедрай палітычнай сацыялогіі. Пры супрацоўніцтве з кафедрай паліталогіі і сацыялогіі Рэспубліканскага інстытута вышэйшай школы на гісторыка-юрыдычным факультэце ГДУ праведзены семінар палітолагаў і гісторыкаў ВНУ г.Гомеля "Асаблівасці трансфармацыйных палітычных працэсаў у Рэспубліцы Беларусь". На семінары з асноўнымі дакладамі выступілі загадчык кафедры паліталогіі і сацыялогіі В.І.Бабровіч, кандыдаты філасофскіх навук, дацэнты І.І.Бугрова і С.А.Навумава з Рэспубліканскага інстытута вышэйшай школы.

У ходзе дыскусіі па тэме семінара склалася агульная думка не толькі аб высокай эфектыўнасці і карыснасці такой формы павышэння кваліфікацыі, але і неабходнасці яе ўкаранення ў якасці асноўнай.

**У.КАЧАТКОЎ,**
**загадчык кафедры палітычнай сацыялогіі, дацэнт.**

## АБ БРАТАХ НАШЫХ МЕНШЫХ

Вялікабрытанскае Каралеўскае таварыства па прадухіленню жорсткага абыходжання з жывёламі правяло 5-дзённы лекцыйна-метадычны курс па арганізацыі кампаній і стварэнню прытулкаў для жывёл. Цудоўны Дом адпачынку "Снегіры" у маляўнічым кутку Падмаскоўя гасцінна прымаў удзельнікаў семінара, сярод якіх была старшыня Гомельскага таварыства абароны жывёл, ст. выкладчык кафедры псіхалогіі і даву-заўскай падрыхтоўкі ГДУ Т.В.Аўдоніна.

Семінар праводзілі Раймонд Інгс, спецыяліст RSPCA па навучанню і Бэн Сімс, менеджэр праектаў для Цэнтральнай і Усходняй Еўропы. Яго ўдзельнікі правялі вялікую работу, выконваючы шматлікія заданні сваіх трэнераў: гэта былі і мазгавыя атакі, складанне бюджэту для мерапрыемства па фандрэйзінгу, прэзентацыі кампаній па лабіраванню і стварэнню прытулкаў для бяздомных жывёл і інш.

Вынікам семінара было ўручэнне яго ўдзельнікам адпаведных сертыфікатаў паслом Вялікабрытаніі ў Маскве, а таксама падарункаў (чамаданчык "Аптэчка першай дапамогі для дамашніх жывёл") з рук спонсара семінара. Атрымалі яны і друкаваную прадукцыю, неабходную ў працы арганізацый па абароне жывёл, ад трэнераў курса, а таксама фірменныя футболкі ад Рэя Інгса асабіста.

Т.В.Аўдоніна, як адзіны прадстаўнік Беларусі ад зоаабарончых арганізацый, была ўдастоена гонару размаўляць з Паслом Вялікабрытаніі аб праблемах абароны жывёл у нашай рэспубліцы.

Нядаўна Гомельскае таварыства абароны жывёл было прынята ў Вялікабрытанскае Каралеўскае таварыства за недапушчальнасць жорсткага абыходжання з жывёламі, і яму ўручаны адпаведны сертыфікат аб прызнанні.

**(Наш кар.)**

**Владимир ИВАНОВ,**
*выпускник ГГУ 1995 года*

# НАЧАЛО РОМАНТИКИ

Всё имеет начало и конец. Начало было таким. Сколько ни доказывал в геологическом управлении, что хочу работать в Саянах, меня направили на равнину, в Тагнинскую геологическую экспедицию разведывать угольное месторождение.

И вот я трясусь в грузовом такси вместе с бабками и их мешками. Старушки экипированы хорошо, в валенках, в полушубках. Я -- похуже. Шинелишка, лыжный костюм и лыжные ботинки. А за парусиной такси мороз за тридцать. В середине пути старушки стали беспокоиться за мои ноги. Но ничего, обошлось.

Геологические таёжные коллективы прекрасные. В тот же день я оформлен старшим техником-геологом. Обут, одет по-таежному, накормлен. Получил аванс, угол в промерзшем общежитии буровиков. Можно начинать участие в романтике.

Это только со стороны мы кажемся фанатиками, романтиками, а так -- весьма живые люди, и мороз к нам также под телогрейку залазит. Вы документировали керн, когда мороз 40°? Керн -- это те столбики породы, которые поднимают буровики. Их обмывают, укладывают в специальные деревянные ящики. Я веду геологический журнал. Чертыхаясь, колочу породу молотком, описываю, грею руки у костра. Алевролит, аргиллит, песчаник. Наконец, уголь. Его отбираю отдельно, его -- в экспедиционную лабораторию. Там над ним колдуют весьма симпатичные лаборантки. Длиннопламенный, спекающийся. А ниже может быть другой. И снова пыхтит двигатель, вращая штанги, коронка вгрызается все глубже и глубже и так до 350 м. Там угленосная толща кончается. В одной скважине двадцать угольных пластов, в другой -- двадцать пять и почти все толщиной 1-5 метров. Хорош уголёк. Но я как-то ему не рад особенно, посинел, поглядываю на часы -- скорее бы конец смены и пришла дежурная машина...



Едем на базу, старший мастер в кабине, мы -- наверху. А над нами разлапистые сосны и ели, потом кустарник... Тайга давит, угнетает. Такое было первое впечатление у меня, выросшего в степи. Потом привык. Обычный лес, только более дикий. У нас в Беларуси их сколько угодно: сырых, заболоченных.

Через месяц, в январе, меня направляют документировать нашу разведочную шахту. Это настоящая шахта, с деревянным креплением. Наклонный ствол глубиной 100 м, от него отходит горизонтальная выработка -- квершлаг длиной 300 м. Наверху мороз, а в квершлаге тепло, капёж, струи воды текут за шиворот. Вот такая, понимаете, романтика. Проходка квершлага продвигается медленно -- 30 метров в месяц. Здесь работало 3 бригады проходчиков. Они сперва бурят шпуры, потом их заряжают и взрывают породу. Время уходит и на проветривание шахты после взрыва. И только после этого грузят породу в вагонетки, толкают к стволу, поднимают наверх. В общем, не работа, а тянучка. А тут ещё появляется ежедневно некто тонкий, невысокий, задиристый и требует, чтобы дали время на документацию забоя.

Я им мешал, и они выражались русским слогом весьма откровенно... Наконец, мне повезло. Шахта стала из-за гриппа, и я смог поработать в забое 6 часов, получил своеобразный эталонный материал, но он чуть не стоил мне жизни. Засунул свой журнал в полевую сумку и пошел к стволу шахты. Наверху, в избушке, меня должен встречать дежурный. Иду, привычно чертыхаясь, когда струи воды текут за шиворот. Что-то меня настораживает, много воды внизу, уже до колен, а до ствола ещё 150 м. Связи с дежурным никакой. Бреду дальше, воды по пояс, по шею. Ствола шахты не видно, но он близко. Иду, хватая воздух между брёвен крепи, ныряю, ударяюсь о лестницу ствола. Поднимаюсь на три ступеньки, сажусь, долго отдыхаю. Поднимаюсь по лестнице вверх, тяжело дышу. Уже чувствуется мороз. В голове единственная мысль -- это дежурный не включил насос. Я ему сейчас наставлю фонарей! Наконец, я наверху, мгновенно превращаюсь в ледяную статую, иду к избушке. Дверь нараспашку, дежурный исчез, печь не горит. Подхожу к рубильнику и включаю насос, чтобы не затопило шахту полностью. Очень холодно, нужно искать выход, чтобы не замёрзнуть. Вдруг блеснула мысль: на продолжении квершлага, в километре, буровая бригада, там печь, тепло, там -- спасение. Пошёл по снегу к буровикам. И, как вы понимаете, дошёл, иначе не было бы этого рассказа. Спасли. Вот такое начало романтики.



# ПЕРАДНАВАГОДНЯЯ МАЗАІКА



## УНІВЕРСАЛЬНЫ РАЗМОЎНІК ДЛЯ ЗНАЁМСТВА

*/ВЫБЕРЫЦЕ НАЙБОЛЬШ ПАДЫХОДЗЯЧЫ ДЛЯ ВАС ВАРЫЯНТ/*

*-- Добры дзень! (раніца, вечар, ноч, палярны дзень, палярная ноч...).*

*-- Ці не праўда, які цёплы ласкавы вецер (дождж, снег, град, цунамі, землетрасенне, вывяржэнне, падзенне метэарыта, падзенне нараджальнасці...).*

*-- А ваша імя Іра (Клава, Аўдоцця, Марфа, Глікер'я, Фёкла, Эльвіра, Эрыка, Моніка, Электроніка, Рэйганоміка)?*

*-- Дайце мне ваш тэлефон (тэлеграф, тэлетайп, факс, тэлевізар, пыласос, сокавыціскалку...).*

*-- Дазвольце вас запрасіць на вячэру (снядaнак, абед, ланч, файв-аклок, аперытыў, сціпль-чэз, плексіглаз, проціваrаз...).*

*-- У мяне ёсць два білеты на вячэрні спектакль (дзіцячы ранішнік, начнік, суботнік, капуснік, маркоўнік, тварожнік, сырнік, венік, джын-тонік...).*

*-- Гэта не вы адпачывалі ў мінулым годзе ў Сочы (Сухумі, Батумі, Рыцы, Капа-Кабане, Варадэра, Ніцы...)?*

*-- А вы мне адразу спадабаліся (не адразу, паступова, не спяшаючыся, не ўсё адразу, не спадабаліся, цярпець не магу, прэч адсюль!).*

*-- А вам ніхто не казаў, якая вы прыгожая (дарагая, добрая, выдатная, недарагая, імпартная, вазьму дзве...).*

*-- Вунь стаіць мой аўтамабіль (самалёт, параход, паравоз, алень, вярблюд, ішак, казёл, лапух, балван...).*

*-- Не падумайце, што я нейкі вулічны лавелас (дон-жуан, альфонс, фанфарон, піжон, балван, балабон, бадмінтон, меналалом...).*

*-- Дазвольце адкланяцца (адкашляцца, адфыркацца, адбрыкацца, акрысіцца, ад'ездзіцца, наезніца...).*

## ФРАЗЫ

•Калі б чалавеку ўсяго хапала, чаго б ён яшчэ захацеў?

•Гады нас вучаць цаніць мінуту.

•Аб усім думаць добра -- дрэнна.

•Які смак меў яблык разладу?

•Для тых, хто траціць дарэмна шмат часу, гэта раскоша ці беднота?

•Найбольшым попытам карыстаюцца тавары, якія ніхто, ніколі і нідзе не рэкламуе.

•Калі з трох чэргаў вы выбераце самую кароткую, то яе будзе абслугоўваць самая марудлівая прадаўшчыца.

•Ці можна любавацца сабою, пазіраючы ў крывое люстэрка?

***

•Студенты как щенки: всё понимают, глаза умные, только сказать ничего не могут.

•Умный учится на чужих, дурак -- на своих ошибках.

•Интересно, сколько надо иметь денег, чтобы понять, что не в них счастье?

•Если идея не помещается в голове, значит, не в ту голову попала.

•Хороший преподаватель тот, студенты которого способны более его самого.

•Человек может быть всем, а собака -- только другом.

•Если человек начинает чувствовать одиночество, то холостяк должен жениться, а женатый -- развестись.

•Честность -- это, когда хочешь сказать одно, а говоришь правду.




## УСЁ ЎЛІЧЫЎ

*-- Ура! У гэтым месяцы жанюся! -- Сынок-студэнт крычаў. -- Ты чуеш, тата?*

*-- Ага!.. А жыць на што?*

*-- Ды пераб'юся: Мая стыпендыя ды плюс твая зарплата.*




## СМЯШЫНКІ АД ДЗЕДА МАРОЗА

Пяцігадовы сын пытаецца:

-- Тата, а ты ведаеш, на колькі хапае аднага цюбіка зубной пасты?

-- Не ведаю, сынок.

-- На ўсю прыхожую, гасціную і палову лоджыі...

***

Пяць гадоў назад мы з мужам упершыню адпачывалі асобна адзін ад аднаго.

-- Ну і як? Мужу спадабалася?

-- Не ведаю: ён яшчэ не вярнуўся.

***

Дарагая, вось ужо дзесяць гадоў на пытанне пра твой узрост я адказваю, як мы калісьці дамовіліся: "Трыццаць адзін год". Выбачай, але мне ўжо няёмка.

-- Няёмка? Глупства! Няхай усе ведаюць, што ты не з тых, хто сёння гаворыць адно, а заўтра другое.

***

-- Дарагі, уяўляеш, я пахудзела на два кілаграмы!

-- Наўрад ці. Паспрабуй устаць на вагі пасля таго, як накладзеш грым перад адыходам у госці на сустрэчу Новага года.

### ЯК ЗАЎСЁДЫ!

-- Як, сынок, здаў экзамены?

-- Як заўсёды, на "пяць"! Адзін -- на "два", другі -- на "тры".

### ПАСПРАБУЙ ЗАПЯРЭЧЫЦЬ

-- Чаму ты вырваў з майго сшытка лісты?

-- Таму што на ім напісана: "Агульны сшытак".



## 1997 год -- год Быка

Згодна календара, прынятага ў Японіі і іншых краінах Усходу ў межах 12-гадовага цыкла, кожны год праходзіць пад знакам якой-небудзь жывёлы. Чалавек, народжаны ў пэўным годзе, атрымлівае шэраг прыроджаных уласцівасцей, у залежнасці ад якіх вызначаецца яго лёс. Папулярнасць гэтага календара на Усходзе вельмі вялікая. Жадаючы задаволіць зацікаўленасць паклоннікаў усходніх традыцый, мы паведамляем, што 1997 год -- год Быка.



## НОВОГОДНИЙ ТОСТ

Желаем счастья вам  
Пускай не вечного,  
Но чтоб хорошего и  
безупречного,  
Чтоб год был месяцем,  
А месяц -- сутками,  
Чтоб было весело,  
Чтоб было с шутками,  
Чтобы обычное не стало ношею,  
А в общем -- самого всем вам  
хорошего!

## СПАРТЫЎНЫЯ НАВІНЫ

У Лідзе прайшлі рэспубліканскія спаборніцтвы па шматбор'ю "Здароўе" сярод спартыўных сем'яў. Дзве вышэйшыя ўзнагароды, а з імі і даволі вялікія грашовыя ўзнагароджанні атрымалі спартыўныя сем'і кафедры фізічнага выхавання Г.П.Барадзіной і В.В. Ткачова.

***

У Гомельскім палацы лёгкай атлетыкі прайшлі чарговыя гульні чэмпіянату Беларусі па гандболу сярод жаночых каманд. Гандбалісты "Універсітэта" прымалі каманду "Друць" з Бялыніч Магілёўскай вобласці. У мінулых гульнях нашы студэнткі атрымлівалі перамогі над гэтай камандай. Акрыленыя поспехам, на гэты раз яны не настроіліся на сур'ёзную сустрэчу і як вынік -- паражэнне ў першай гульні: 26:30. У другой сустрэчы настаўнік нашых гандбалістак заслужаны трэнер Беларусі Валерый Крукоўскі змог натхніць каманду на барацьбу да перамогі і ў выніку -- выйгрыш з лікам 20:18.

***

У Мінску прайшлі рэспубліканскія спаборніцтвы па гандболу сярод мужчынскіх каманд па праграме студэнцкай спартакіяды.

Гандбалісты "Універсітэта" на чале з трэнерам Віктарам Марчуком занялі другое месца. Яны ўступілі толькі камандзе Акадэміі фізічнай культуры і спорту. На трэцім месцы -- Беларуская дзяржаўная політэхнічная акадэмія.

***

Завяршыліся спаборніцтвы па шахматах універсітэцкай спартакіяды.

Зноў засмуціў арганізатараў факультэт фізічнай культуры, які не выставіў каманду.

Сярод факультэтаў месцы размеркаваліся так: матэматычны -- І месца, фізічны -- 2-е, гісторыка-юрыдычны -- 3-е. Далей -- біялагічны, эканамічны, філалагічны і геолага-геаграфічны факультэты.

Як і ў мінулыя гады, галоўную судзейскую калегію ўзначальваў наш ганаровы ветэран Аляксандр Аляксеевіч Косцікаў, а значыць, спаборніцтвы былі дакладна арганізаваны і праведзены.

Намеснікі дэканаў факультэтаў па спартыўна-масавай рабоце прасілі выказаць словы ўдзячнасці Аляксандру Аляксеевічу.

**В.МАРЧАНКА,**
**наш спартыўны аглядальнік.**



*У снежным уборы.*

**ГОМЕЛЬСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ імя Ф.СКАРЫНЫ**

аб'яўляе конкурс на замяшчэнне вакантных пасад па кафедрах:

-- эканамічнай інфарматыкі і АСК -- заг. кафедры;
-- беларускай культуры -- асістэнта;
-- палітычнай сацыялогіі -- асістэнта;
-- англійскай мовы -- выкладчыка.

Тэрмін падачы заяў -- не пазней І месяца з дня апублікавання паведамлення.

Заявы накіроўваць на адрас: 246699, г.Гомель, вул.Савецкая, 104.

**РЭКТАРАТ.**

Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытат, эканамічных даных, асабістых імён, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытый публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не раздзяляючы пункту гледжання аўтара.

ЗАСНАВАЛЬНІК -- Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны.

Наш адрас: 246699, г. Гомель, вул, Савецкая, 104, пакой 1-18, тэл. 57-43-21.
Рэгістрацыйны № 263

Спонсар газеты -- прафком студэнтаў.

Газета набрана і зверстана на настольна-выдавецкім комплексе ІВЦ ГДУ, аддрукавана на фабрыцы "Паласдрук", г.Гомель, вул. Савецкая, 1.

Рэдактар
Ул.П. БАЛОГА

Аб'ём 1 друк. арк.
Тыраж 1.000 экз.
Заказ 614
Падпісана да друку 20.12.96.